ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 23 (583) | Субота, 8 верасня 1984 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап



НА ЗДЫМКУ: урачыстае адкрыццё пасвячэння першакурснікаў у студэнты.

Фота У. Чысціка.

## У СТУДЭНЦКУЮ СЯМ'Ю

### ва ўрачыстай абстаноўцы прынялі першакурснікаў

СЁЛЕТА ўпершыню ў нашай краіне 1-га верасня адзначаўся Дзень ведаў. ...Сонечным і цёплым выдаўся ранак. Яшчэ задоўга да пачатку завяткаў вуліцы Гомеля запоўніліся па-святочнаму апранутымі дзецьмі, юнакамі і дзяўчатамі. С прыўзнятым настроем яны крочылі ў школы, прафтэхвучылішчы, тэхнікумы, ВНУ.

Па добрай традыцыі ў першы вераснёўскі дзень у нашым універсітэце адбылося ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Роўнымі шарэнгамі яны выстраіліся ля вучэбнага корпуса № 1. Разам з імі — дэканы, загадчыкі кафедр, выкладчыкі і супрацоўнікі. На ўрачыстасць прыйшлі і многія бацькі першакурснікаў.

На ўсё наваколле разносіцца музыка. І вось да мікрафона падыходзіць вядучы і аб'яўляе аб адкрыцці ўрачыстага пасвячэння першакурснікаў у студэнты.

Велічна прагучалі Гімн СССР і Гімн Беларускай ССР. Сцягі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта выносяць кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга член-карэспандэнт АПН СССР, прафесар І. Ф. Харламаў, ленінскі стыпендыят студэнт 5 курса фізічнага факультэта Ігар Каляскін, ветэран студэнцкага будаўнічага руху студэнт 5 курса эканамічнага факультэта Віктар Васюк, член зборнай студэнцкай каманды Беларусі па баскетболу студэнт 4 курса факультэта фізвыхавання Уладзімір Дубадзелаў.

З цёплымі пажаданнямі да першакурснікаў звярнуўся в. а. рэктара член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў.

Усе прысутныя з вялікай увагай выслухалі выступленне-наказ ветэрана вайны і працы, сакратара партыйнага бюро біялагічнага факультэта А. В. Хількевіча.

Ва ўрачыстай абстаноўцы першакурснікам быў уручаны сімвалічны студэнцкі білет.

Пяцікурснік гісторыка-філалагічнага факультэта ленінскі стыпендыят Іван Афанасьеў уручыў першакурсніцы эканамічнага факультэта Таццяне Жукавай Ключ ведаў.

Выдатныя традыцыі мае наш універсітэт у студэнцкім будаўнічым руху. Сёлетнім першакурснікам прадстаіць развіваць і замацоўваць гэтыя традыцыі. Як эстафету выдатных спраў перадаў пяцікурснік фізічнага факультэта ветэран студэнцкага будаўнічага руху Аляксандр Хлебаказаў першакурсніку гісторыка-філалагічнага факультэта камандзіру СБА «Квазар» Барысу Ліозанаву сімвалічную кельму.

Першакурсніца эканамічнага факультэта Надзея Туманава зачытала клятву, паўтараную сотнямі галасоў, на вернасць быць дастойнымі прадаўжальнікамі лепшых традыцый універсітэта, настойліва авалодваць ведамі, каб стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства.

Усхваляваным было на пасвячэнні першакурснікаў у студэнты выступленне сакратара Гомельскага абкома камсамола Т. В. Граблеўскай, якая роўна дзесяць гадоў таму назад таксама ўпершыню пераступіла парог нашага універсітэта, дзе атрымала пуцёўку ў працоўнае жыццё.

Ва ўрачыстыя мінуты ўступлення першакурснікаў у студэнцкую сям'ю ва універсітэцкім парку да помніка на брацкай магіле загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны вызваліцеляў нашага горада былі ускладзены кветкі — даніна глыбокай падзякі барацьбітам за сённяшні шчаслівы дзень савецкіх людзей.

**Ва ўрачыстым пасвячэнні першакурснікаў у студэнты прынялі ўдзел першы намеснік старшыні выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў М. І. Скрыннікаў і сакратар Цэнтральнага РК КПБ В. І. Чэпелаў.**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Адбылося першае пасяджэнне Савета універсітэта ў новым навучальным годзе. Абмеркавана пытанне аб стане падрыхтоўкі да яго. З паведамленнямі выступілі дэканы факультэтаў, загадчыца вучэбнага аддзела Н. І. Папкова, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. А. Шаўчэнка, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў.

Разгледжаны і зацверджаны мерапрыемствы па рэалізацыі рашэнняў красавіцкага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС і пастановы «Аб асноўных напрамках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы».

Савет універсітэта прыняў рашэнне аб раздзяленні кафедры СССР і ўсеагульнай гісторыі на кафедру гісторыі СССР і БССР і кафедру ўсеагульнай гісторыі, для якіх адпаведна зацверджаны спецыялізацыі «Гісторыя СССР» і «Усеагульная гісторыя».

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТАРЫ

За выдатныя поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці на першы семестр новага 1984/1985 навучальнага года назначаны Ленінскія стыпендыі:

**Івану АФАНАСЬЕВУ** — студэнту V курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

**Ігару КАЛЯСКІНУ** — студэнту V курса фізічнага факультэта.

**Іне МАЙДАНОВІЧ** — студэнцы III курса эканамічнага факультэта.

**Валянціне МАЛАШАНКА, Алене МАХНОВАЙ, Наталлі ЦАЛЯНЧУК** — пяцікурсніцам, **Алене ЦІМАШЭНКА** — студэнцы III курса матэматычнага факультэта.

Студэнцы III курса гісторыка-філалагічнага факультэта **Валянціне БЫХАЎЦАВАЙ** назначана стыпендыя імя Янкі Купалы

## ЗНАЁМЦЕСЯ: ПЕРШАКУРСНІКІ—84

Бадай, ужо канчаткова ўлегліся хваляванні ўступных конкурсных экзаменаў. Для адных абітурыентаў яны прынеслі вялікую радасць ажыццёўленай мары, для другіх сталі непераадольным бар'ерам. Найбольш падрыхтаваныя юнакі і дзяўчаты ўліліся ў студэнцкую сям'ю, для тых, хто не здолеў заваяваць гэта права, прадставіцца магчымасць выпрабаваць сябе ў наступныя гады пасля набыцця пэўнага жыццёвага вопыту.

Сёлетнія ўступныя экзамены ў ВНУ мелі істотныя асаблівасці. Гэта звязана з рэалізацыяй рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. У прыватнасці, ужо не ўлічваўся ў агульным паказчыку сярэдні бал атэстатаў, хаця ён і не страціў свайго значэння. Наадварот, пашырыліся магчымасці паступлення па «эксперыменту» для тых, у каго былі атэстаты без троек. У гэтым годзе многія абітурыенты мелі льготы для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці.

Першакурснікамі нашага універсітэта сёлета стала 700 чалавек — на 50 менш, чым летась. Па адной групе зменшаны набор на біялагічны факультэт і спецыяльнасць «прыкладная матэматыка».

Першымі, хто атрымаў права быць залічанымі ва універсітэт, сталі 78 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія паспяхова вытрымалі выпускныя экзамены. На астатнія 622 месцы па 11 спецыяльнасцях прэтэндавала 1424 абітурыенты. У сярэднім па 2,3 чалавека на месца, або на 0,3 больш, чым у мінулым годзе. Увогуле трэба сказаць, што ў гэтым годзе конкурс у наш універсітэт быў адным з самых высокіх за ўсе 15 гадоў яго існавання.

Як жа гэты паказчык характарызуецца па факультэтах? На біяфак на адно месца прэтэндавала 4,3 абітурыента (летась — 2,4), на аддзяленне гісторыі — 3,6 (2,8), на спецыяльнасць «эканоміка працы» — 2,8 (3,4), руская мова і літаратура — 2,5 (2,1), фізічнае выхаванне — 2,4 (2,7), арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — 2,1 (2,4), матэматыка — 2 (1,8), прыкладная матэматыка — 1,8 (1,8), геалагічны факультэт — 1,8 (2), беларуская і руская мова і літаратура — 1,7 (1,8), на фізічны факультэт — 1,5 (1,8). Сярэдні бал атэстатаў паступаючых раўняўся 4,49 — абсалютна раўназначны леташняму. 1223 абітурыенты мелі атэстаты без троек. Ва універсітэт паступала 120 выпускнікоў школ з залатымі медалямі, 39 маладых спецыялістаў, якія атрымалі дыпломы з адзнакай аб заканчэнні сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і прафтэхвучылішчаў. Летась гэтыя лічбы былі адпаведна 112 і 45.

94 абітурыенты паступалі ва універсітэт, маючы працоўны стаж больш двух гадоў.

Прыведзеныя вышэй паказчыкі сведчаць аб тым, што ў наш універсітэт сёлета паступалі юнакі і дзяўчаты з дастаткова высокай вучэбнай падрыхтоўкай. Пасля ўступных экзаменаў склаўся наступны прахадны бал: аддзяленне гісторыі — 18, рускай мовы і літаратуры і эканомікі працы — 17, арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, матэматыкі, на біялагічны факультэт — 16, на аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры і навукова-вытворчы паток фізічнага факультэта — 15, на спецыяльнасць «прыкладная матэматыка» і геалагічны факультэт — 14, на навукова-педагагічны паток фізічнага факультэта — 12, на факультэт фізічнага выхавання — 21.

63 абітурыенты былі залічаны ва універсітэт з паўпрахадным балам.

**Сярод паступаючых ва універсітэт было 545 гамяльчан, 294 з іх сталі студэнтамі (летась — 306). Не вытрымалі экзаменаў або не прайшлі па конкурсу 20 медалістаў і 21 выдатнік тэхнікумаў і прафтэхвучылішчаў.**

Прыемна адзначыць, што сёлета павялічыўся працэнт (29) паступіўшых ва універсітэт юнакоў (летась 26). Сёлета сярод першакурснікаў 200 юнакоў і 500 дзяўчат. Найбольшая колькасць юнакоў будзе вучыцца на факультэце фізвыхавання і геафаку. На здзіўленне, дзяўчаты аказаліся самымі здольнымі ў матэматыцы. Сярод першакурснікаў па спецыяльнасці «матэматыка» 91 дзяўчына і ўсяго толькі 9 юнакоў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра ўсеагульнай гісторыі горача віншуюць кандыдата гістарычных навук ЦІТОВУ Антаніну Аляксееўну з выпадку прысваення ёй ВАКам вучонага звання дацэнт.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра гісторыі СССР і БССР горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ГЛАДЫШАВА Уладзіміра Сцяпанавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.**

# ЗНАЁМЦЕСЯ: ПЕРШАКУРСНІКІ—84

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.).

Сярод залічаных на першы курс — 93 працэнты беларусаў і рускіх, 5 — украінцаў і 2 працэнты студэнтаў іншых нацыянальнасцей. Ва універсітэце будзе вучыцца 373 дзяцей служачых, 283 — рабочых, 44 — калгаснікаў.

Сярод першакурснікаў — 55 юнакоў, якія ўжо адслужылі ў радах Савецкай Арміі. Некаторыя з іх маюць урадавыя ўзнагароды.

Партыйная арганізацыя ГДУ за лік першакурснікаў павялічыцца на 10 чалавек.

Сёлета ўступныя экзамены ў цэлым прайшлі арганізавана, патрабавальна і добразычліва — у строгай адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Праўда, асобныя змяненні у правілах прыёму і дадатковыя льготы для абітурыентаў прымусілі членаў прыёмнай камісіі працаваць больш напружана і ўважліва. Набыты вопыт спатрэбіцца на будучыя гады.

Прыёмная камісія лічыць, што ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт прыйшло дастойнае папаўненне. Пажадаем жа сённяшнім першакурснікам настойліва авалодваць абранымі спецыяльнасцямі, а пасля вучобы паспяхова прымяняць набытыя веды на практыцы.

**А. НЯВЕРАЎ,**
**адказны сакратар прыемнай камісіі ГДУ, дацэнт.**

## ПРАЦАВАЛІ СТАРАННА

Адміністрацыя і рабочыя будаўнічага ўчастка № 2 Веткаўскай механізаванай калоны № 44 засталіся вельмі ўдзячны байцам будаўнічага атрада «Квазар», сфарміраванага са слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, за старанную працу па добраўпарадкаванню піянерскага лагера ў калгасе «Іскра» Веткаўскага раёна. У дасланым на імя камітэта камсамола універсітэта падзячным лісце названы прозвішчы Б. Ліознага, Р. Байкачовай, С. Герашчанка, А. Дзегцяровай, Л. Саламашанка, П. Пётух. Н. Шпак. Яны не толькі паспяхова спраўляліся з вытворчымі заданнямі, але і на высокім узроўні вялі палітыка-выхаваўчую работу. Байцы атрада выступалі перад будаўнікамі ўчастка з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, лекцыямі. Прысутным асабліва запамятаўся канцэрт, прысвечаны Дню будаўніка.

*Да справаздач і выбараў у прафарганізацыях*

# З ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЮ І АДКАЗНАСЦЮ

У адпаведнасці з рашэннем Прэзідыума ВЦСПС з 1 жніўня пачаліся справаздачы і выбары ў прафсаюзных арганізацыях краіны. Надаючы важнае значэнне гэтай падзеі, Палітбюро ЦК КПСС спецыяльна разгледзела на сваім пасяджэнні пытанне аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з правядзеннем справаздачна-выбарнай кампаніі ў прафесіянальных саюзах. Палітбюро ЦК КПСС адзначыла, што справаздачы і выбары павінны паслужыць няўхільнаму росту ініцыятывы прафсаюзаў у выкананні імі шматгранных функцый, павышэнні адказнасці прафсаюзных камітэтаў за выкананне планаў і сацыялістычных абавязацельстваў, стварэнне належных умоў працы, быту і адпачынку работнікаў, максімальна поўнае ажыццяўленне палажэнняў Закона аб працоўных калектывах. ЦК КПСС нацэльвае прафсаюзныя органы на тое, каб у ходзе сходаў і канферэнцый былі глыбока прааналізаваны дзейнасць прафсаюзных арганізацый, абагульнен накоплены вопыт, вызначаны пэўныя меры па ліквідацыі недахопаў, узмацненню арганізатарскай і выхаваўчай работы.

Удзельнікам прафсаюзных сходаў у прафгрупах, факультэцкіх прафсаюзных арганізацыях неабходна трымаць у цэнтры ўвагі пытанні вытворчай, вучэбнай дзейнасці, далейшага ўдасканальвання сацыялістычнага спаборніцтва. Прафгрупы, прафбюро павінны ўсямерна падтрымліваць і развіваць ініцыятыву калектываў па дастойнай сустрэчы 40-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў.

На сходах належыць уважліва разгледзець ход выканання мерапрыемстваў па ажыццяўленню рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС, школьнай рэформы. У справаздачах прафгрупоргаў і прафбюро павінны знайсці адлюстраванне такія пытанні як выкананне патрабаванняў Статута прафсаюзаў СССР, размеркаванне грамадскіх даручэнняў, ажыццяўленне кантролю за праведзенай работай.

У пярвічных прафсаюзных арганізацыях выкладчыкаў і супрацоўнікаў справаздачна-выбарныя сходы павінны прайсці да 25 верасня, у прафсаюзных арганізацыях студэнтаў — да 18 кастрычніка. Сход у пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі лічыцца правамоцным, калі ў ім удзельнічае не менш двух трэціх членаў прафсаюза.

Трэба звярнуць асаблівую ўвагу на падбор прафсаюзнага актыву, дабівацца паляпшэння якаснага саставу прафгрупоргаў і прафбюро.

Зноў выбраным прафбюро належыць абагуліць крытычныя заўвагі і прапановы, выказаныя на прафсаюзных сходах і прыняць адпаведныя меры па іх рэалізацыі.

**М. МУРАШКА,**
**старшыня прафкома.**
**Н. КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў.**

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

## ЛЕКЦЫЙ, ДАКЛАДАЎ І ГУТАРАК ПА ПЫТАННЯХ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Рашэнні партыі, выступленні таварыша К. У. Чарненкі — баявая праграма дзейнасці камсамола.

Клопаты Камуністычнай партыі аб камсамоле і моладзі.

Ленінскі камсамол — надзейны рэзерв і баявы памочнік партыі.

Узрастанне ролі камсамола ў камуністычным будаўніцтве.

Актыўна ўдзельнічаць у рабоце па ўдасканаленню развітога сацыялізму — галоўная задача камсамола.

Уклад моладзі ў вырашэнне ключавых эканамічных і сацыяльных задач.

Інтэнсіфікацыя народнай гаспадаркі — кроўная справа камсамола.

Моладзь і тэхнічны прагрэс.

Ударныя камсамольскія будоўлі — школа грамадзянскага станаўлення савецкай моладзі.

Працоўны гераізм моладзі ў асваенні багаццяў Сібіры, Далёкага Усходу, Крайняй Поўначы.

Будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі — яркая старонка ў летапісу працоўнай славы камсамола.

Роля камсамола ў пераўтварэнні Расійскага Нечарназем'я.

Актуальныя задачы камсамола ў рэалізацыі Харчовай праграмы.

Свядомая і дысцыплінаваная праца на карысць грамадства — найпершы абавязак і патрыятычны доўг кожнага камсамольца.

Руху камсамольска-маладзёжных калектываў — шырокае развіццё.

Уклад моладзі нашага калектыву ў выкананне заданняў адзінаццатай пяцігодкі.

Маладыя наватары вытворчасці нашага прадпрыемства.

Як моладзь нашага калектыву выконвае заданні па ўзмацненню рэжыму эканоміі?

Працоўная дысцыпліна сярод моладзі на нашым прадпрыемстве.

Значэнне настаўніцтва ў працоўным і маральным выхаванні моладзі.

Ленінскі камсамол у палітычнай сістэме савецкага грамадства.

Актыўны ўдзел моладзі ў кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі — характэрная рыса сацыялістычнай дэмакратыі.

Дзейнасць маладых дэпутатаў нашага сельскага, раённага, гарадскога Савета.

Быць дастойнымі грамадзянамі савецкага грамадства — высокі абавязак моладзі.

Фарміраванне ўсебакова развітай асобы — стратэгічная мэта партыі.

Далейшае паляпшэнне выхавання падрастаючага пакалення — важнейшая партыйная, дзяржаўная, агульнанародная справа.

Вучыцца камунізму — непераходзячы ленінскі запавет моладзі.

Кіраўнік — клапатлівы выхавацель падрастаючага пакалення.

Настойліва фарміраваць у моладзі марксісцка-ленінскі светапогляд, класавую самасвядомасць, непрымірымасць да буржуазнай ідэалогіі.

Патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм савецкай моладзі.

Выхоўваць моладзь на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях партыі і народа.

Фарміраваць у маладога пакалення высокія ідэйна-маральныя якасці.

Узмацніць ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі.

Ленінскі наказ моладзі — вучыцца ваеннай справе сапраўдным чынам.

Абарона сацыялістычнай Айчыны — свяшчэнны абавязак кожнага маладога грамадзяніна Краіны Саветаў.

Камсамол у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ветэранам вайны — камсамольскія клопаты.

Роля камсамола ў ажыццяўленні рэформы школы.

Камсамол — надзейная апора педагагічных калектываў у школе.

Развіваць ініцыятыву, самадзейнасць і творчасць піянерскіх арганізацый.

Павышаць ролю сям'і ў выхаванні маладога пакалення.

Задачы атэістычнага выхавання юнацтва.

Месца пражывання — актыўная сфера выхавання моладзі.

Работа камуніста ў камсамоле — адказнае партыйнае даручэнне.

Удасканальваць стыль, формы і метады работы камсамола.

Партыйнае кіраўніцтва — залог ідэйнасці, баявітасці і творчай актыўнасці камсамола.

Гістарычная адказнасць савецкай моладзі за лёс краіны, сацыялізму і міру.

## ПРАКТЫКА І ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ

Напярэдадні новага навучальнага года на гісторыка-філалагічным факультэце адбыўся адкрыты партыйны сход. Камуністы абмеркавалі пытанне «Аб ролі вучэбных і вытворчых практык у павышэнні эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі». З дакладамі выступілі М. В. Гусева з кафедры гісторыі СССР і БССР і Л. І. Толчыкава з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.

Па абмяркоўваемаму пытанню сваімі думкамі на сходзе падзяліліся У. У. Багамольнікаў, П М. Чайкун, Д. А. Лявончанка, А. А. Рубан, М. Ф. Гуліцкі.

У прынятай пастанове прадугледжаны меры па далейшаму павышэнню ролі вучэбных і вытворчых практык у ідэйна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі.

## ШКОЛА ЗАГАРТОЎКІ

Здаецца, нядаўна мы прыехалі ў зводны будаўнічы атрад «Радзімічы», які аб'яднаў два калектывы: аднаімённы атрад і атрад «Гамяльчанка» гісторыка-філалагічнага факультэта. Нашым месцам дыслакацыі стаў саўгас «Бацвінава» Чачэрскага раёна. У працоўных буднях і гадзінах цікавага адпачынку непрыкметна прахадзіў час. Толькі за тры першыя тыдні мы прапалолі на 40 га гародніну, даглядалі і ўбіралі капусту, буракі, моркву. У дні ўборкі зерневых рабяты старанна папрацавалі і на зернетаку.

Разам з намі ў атрадзе знаходзіліся «цяжкія» падлеткі з ГПТВ-22 і ГПТВ-67 будаўнікоў г. Гомеля. Усе байцы добрасумленна, з пачуццём адказнасці адносіліся да кожнай даручанай справы. Самых цёплых слоў ўдзячнасці заслужылі Людміла Данільчанка, Таня Ярац, Аляксандр Палякоў, Святлана Лапуста, Аксана Саладкова, Іна Краўцова, Пётр Іваноў, Ніна Шумская, Людміла Талсцянкова. Яны ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Чачэрскага райкома ЛКСМБ.

У атрадзе былі праведзены два дні ўдарнай працы. Заробленыя грошы пойдуць у фонд будаўніцтва г. Гагарына і ў фонд XII сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, які адбудзецца ў г. Маскве.

У час працоўнага семестра мы дапамаглі адрамантаваць мясцовую школу, збіралі лекавыя травы, удзельнічалі у нарыхтоўцы зялёных кармоў для грамадскага статку, шэфствавалі над вэтэранамі вайны. Рабяты з цікавасцю ўдзельнічалі ў аперацыі «Летапіс Вялікай Айчыннай», выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Вечарамі у лагеры атрада, які размяшчаўся ў вёсцы Шылавічы, часта ішлі рэпетыцыі агітбрыгады, арганізоўваліся лекцыі, праводзіліся палітінфармацыі. Нашым пастаянным сябрам быў спорт.

Жыццё ў студэнцкім атрадзе праходзіла весела і цікава. Мы вельмі задаволены тым, што прыехалі менавіта ў саўгас «Бацвінава». Нас сустрэлі вельмі гасцінна, забяспечвалі фронтам работ, стварылі добрыя жыллёвыя ўмовы. За ўсё гэта мы выказваем кіраўніцтву саўгаса сваю студэнцкую падзяку. Лічым, што аказалі гаспадарцы значную дапамогу.

**Л. ФІСЮК,**
**камісар зводнага атрада «Радзімічы».**

## *Рэха працоўнага семестра-84*

**РЭКТАРУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА, АКАДЭМІКУ АН БССР Б. В. БОКУЦЮ,**

**САКРАТАРУ ПАРТКОМА УНІВЕРСІТЭТА М. І. СТАРАВОЙТАВУ.**

Аддзел культуры Акцябрскага райвыканкома выказвае ўдзячнасць студэнцкаму атраду імя ЛКСМБ Гомельскага дзяржаўнага універсітэта за добрасумленную працу на будаўніцтве музея народнай славы Акцябрскага раёна, за вялікую грамадскую работу па аказанню практычнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, дзіцячаму саду № 1, за цікавыя, змястоўныя выступленні агітбрыгады перад жыхарамі г. п. Акцябрскі і Акцябрскага раёна. Ва ўсіх практычных справах студэнты будаўнічага атрада паказалі высокую арганізаванасць, дысцыпліну, свядомасць.

Студэнцкі будаўнічы атрад імя ЛКСМБ узнагароджан Ганаровай граматай аддзела культуры Акцябрскага райвыканкома.

**Л. КАСПЯРОВІЧ,**
**загадчыца аддзела культуры Акцябрскага райвыканкома.**

* * *

**ДЭКАНУ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ПРАФЕСАРУ У. Д. АРЭШЧАНКУ, САКРАТАРУ ПАРТБЮРО ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Б. І. ВРУБЛЕЎСКАМУ.**

Дырэкцыя музея народнай славы Акцябрскага раёна выказвае ўдзячнасць байцам атрада бязвыплатнай працы імя ЛКСМБ за вялікую дапамогу, аказаную ў рэканструкцыі музея народнай славы.

Гэты аб'ект, які ўзводзіцца напярэдадні 40-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, вельмі важны для раёна, для таго, каб лепш знаёміць моладзь са слаўнай гісторыяй Рудабельскай рэспублікі. Работа па рэканструкцыі і ўзвядзенню новага будынка выканана ў тэрмін, з добрай якасцю.

Разам з вытворчай праграмай атрадам выканана вялікая работа па ідэйна-палітычнаму і ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Добраўпарадкаван помнік жыхарам г. п. Акцябрскі, якія былі спалены нямецка-фашысцкімі акупантамі. Байцы атрада шэфствавалі над 9 сем'ямі загінуўшых воінаў, ветэранамі. Пры СБА дзейнічаў лагер-спадарожнік, у якім былі арганізаваны гурткі «Умелыя рукі», спартыўны, літаратурны. Сумесна з дзецьмі лагера-спадарожніка і ветэранамі праведзен паход па месцах баявой славы 123-й партызанскай брыгады.

Хочацца адзначыць высокую дысцыпліну, згуртаванасць байцоў атрада. Не выпадкова на раённым злёце СБА яны занялі першае месца. Мы ўдзячны дэкану эканамічнага факультэта за накіраванне гэтага атрада ў г. п. Акцябрскі і выказваем упэўненасць, што традыцыі шэфства над Акцябрскім раёнам будуць працягнуты.

**В. ПАДУТА,**
**дырэктар музея народнай славы Акцябрскага раёна.**

# ЧАСЦІНКУ СЭРЦА — НАРОДНАЙ СЛАВЕ

Зводны студэнцкі атрад Гомельскага дзяржаўнага універсітэта — адзін з лепшых на Гомельшчыне. Ён неаднаразова выходзіў пераможцам у абласным сацыялістычным спаборніцтве, узнагароджваўся ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ, пераходнымі Чырвонымі сцягамі прымаючых арганізацый. Самай высокай адзнакай яго заслуг стаў Памятны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, якога ўдастоена камсамольская арганізацыя ГДУ за актыўны ўдзел у будаўніцтве, меліярацыі земляў Палесся, за поспехі ў вучобе і грамадска-палітычным жыцці.

Патрыятычны рух студэнцкіх атрадаў ва універсітэце развіваецца па розных напрамках. Асабліва значэнне цяпер набываюць СБА камуністычнай бязвыплатнай працы. Наш расказ — пра атрад імя Ленінскага камсамола Беларусі.

### РАЎНЕННЕ БЯРУЦЬ НА КАМАНДЗІРА

Пра Міхаіла Карповіча даводзілася чуць неаднаразова. Пра хлопца гаварылі як пра актывіста, выдатніка вучобы. І вось сядзім з ім удваіх у адным з пакояў інтэрната Акцябрскага сельскага прафесійна - тэхнічнага вучылішча. Тут размясцілі іх атрад. Міша аказаўся вельмі ветлівым і прыцягваючым да сябе чалавекам.

Паступова размова зайшла аб атрадзе, яго справах. Пра ўсіх байцоў камандзір гаварыў з павагай. Амаль ні адзіным словам не абмовіўся аб цяжкасцях. Яны ж былі пачынаючы ўжо з арганізацыі атрада. Не сакрэт, далёка не кожны студэнт адразу дасць згоду удзельнічаць у працоўным семестры без належнага заработку. Не адразу знайшліся аднадумцы наконт гэтага і на эканамічным факультэце. Міша гутарыў з многімі юнакамі і дзяўчатамі, тлумачыў глыбокі сэнс камуністычнай бязвыплатнай працы ў перыяд падрыхтоўкі да слаўнага 40-годдзя перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. І актывісты падтрымалі яго. Адной з першых адгукнулася на каштоўную ініцыятыву малады член партыі, цяпер ужо другакурсніца эканамічнага факультэта Таня Жырун. Гэта ёй рабяты даверылі быць камісарам атрада. Ну, а пра камандзіра і пытанне не стаяла. Усе байцы аднагалосна назвалі прозвішча Карповіча. І не выпадкова. Міхаіл не толькі з'явіўся ініцыятарам стварэння СБА бязвыплатнай працы, але і мае шэраг іншых адметных вартасцей. Ва універсітэт ён прыйшоў пасля службы ў радах Савецкай Арміі. Пачынаў вучобу на падрыхтоўчым аддзяленні, набыў вялікі вопыт работы ў студэнцкіх атрадах. Спачатку быў камандзірам СБА «Белая Русь», які працаваў на Усесаюзнай ударнай будоўлі — заводзе «Гомсельмаш», затым два летніх семестры з'яўляўся галоўным інжынерам Рагачоўскага занальнага штаба СБА, летась зноў узначальваў будаўнічы атрад, стаў яго важаком і цяпер. Гэта пяты працоўны семестр Міхаіла Карповіча. Бадай, з такім службовым спісам удзелу ў студэнцкім будаўнічым руху сярод былых і цяперашніх выхаванцаў Гомельскага дзяржуніверсітэта знойдзецца нямнога. Але ў гэтым Міхаіл не бачыць нічога выключнага.

— Сваё студэнцкае жыццё без удзелу ў працоўным семестры я проста не ўяўляў, — гаворыць камсамолец. — Шкада, што ён стаў для мяне ўжо апошнім. Вучоба ва універсітэце падыходзіць да канца.

Гэтыя словы Міхаіл вымавіў з нейкім асаблівым пачуццём. Сапраўды, яго біяграфія як нястомнага актывіста студэнцкага будаўнічага руху заканчваецца. Але аб ёй яму заўсёды будуць нагадваць два нагрудныя знакі «Маладому гвардзейцу адзінаццатай пяцігодкі». Ганаровыя граматы, якімі Міхаіл узнагароджваўся за доблесную працу.

### ДАЛУЧЭННЕ ДА ГІСТОРЫІ

Сімвалічна, што атрад камуністычнай бязвыплатнай працы на чале з Міхаілам Карповічам вырашыў правесці працоўны семестр-84 у Акцябрскім раёне на зямлі былой легендарнай Рудабельскай рэспублікі. Гэта зямля ў гады Вялікай Айчыннай вайны не скарылася нямецка-фашысцкім захопнікам. Тут працягвала існаваць Савецкая ўлада. Над будынкам сельскага Савета палымнеў чырвоны флаг. Акцябрскі раён быў цэнтрам партызанскага руху ў Беларусі.

У Рудабелцы свята ўшаноўваюць памяць аб героях, аб тых, хто аддаў сваё жыццё за наш шчаслівы сённяшні дзень. Аб іх расказваюць сваім наведвальнікам і шматлікія экспанаты Акцябрскага музея народнай славы. Іх ужо сабралі столькі, што яны не ўмяшчаюцца ў адным памяшканні. Таму кіраўніцтва раёна вырашыла пабудаваць яшчэ адзін аднатыпны будынак і стварыць музейны комплекс. Гэты важны аб'ект прапанавалі атраду Міхаіла Карповіча. Рабяты з задавальненнем згадзіліся, хаця ведалі, што давядзецца нялёгка. На новабудоўлю не выдзялялася спецыяльных фондаў будматэрыялаў. У раёне ўсю надзею ўсклалі на мясцовыя гаспадаркі і арганізацыі. Натуральна, пры такіх абставінах пазбегнуць пэўных няўвязак было проста немагчыма. Але студэнты заручыліся поўнай падтрымкай раённага камітэта партыі і райкома камсамола. Будатрадаўцаў не падвялі. Нарыхтоўка кармоў, жніво патрабавалі да сябе шмат увагі. Нягледзячы на гэта, першы сакратар райкома КПБ М. М. Судас і першы сакратар РК ЛКСМБ С. І. Зарэчны вельмі часта знаходзілі час, каб зазірнуць на новабудоўлю па вуліцы Чапаева. А байцы атрада, якія абавязаліся сіламі 15 чалавек асвоіць 25 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, трымалі слова цвёрда. З часам не лічыліся, выконвалі работы, нават не прадугледжаныя дагаворам. Натуральна, асноўная нагрузка ўскладвалася на хлопцаў — Міхаіла Карповіча, Сяргея Лутчанку, Віктара Шуцікава. Разам з імі сумленна працавалі і дзяўчаты: Таццяна Жырун, Наталля Прахарэнка, Таццяна Кавалёва, Людміла Казлова, Ала Рагіна, Таццяна Балыкова, Ларыса Маджэра, іншыя іх сяброўкі. Гэта ім вельмі часта адрасаваліся словы: «Працалюбівыя рабяты, малайцы!» Іх гаварылі супрацоўнікі музея, у райкоме партыі і райкоме камсамола, у аддзеле культуры і ў іншых арганізацыях, з якімі мелі справу будатрадаўцы.

Усведамляць гэта прыемна. Рукамі энтузіястаў зроблена многае. Узведзены яшчэ адзін будынак для музея народнай славы, які прыме наведвальнікаў да 40-годдзя Вялікай Перамогі. І можна з упэўненасцю сказаць, што паток яго наведвальнікаў значна павялічыцца. Хаця і раней іх тут было нямала. У прыватнасці, за мінулы год пазнаёміліся з экспанатамі музея, а таксама сустрэліся з жывымі ўдзельнікамі і сведкамі слаўнай гісторыі Рудабелкі каля 15 тысяч чалавек. Сюды прыязджаюць дэлегацыі з усёй Беларусі і далёка з-за яе межаў. Акцябрскі музей народнай славы прымаў таксама замежных гасцей — турыстаў з ГДР.

### ЗАПАМЯТАЕЦЦА НАДОЎГА

Байцы атрада камуністычнай бязвыплатнай працы вярталіся ў Гомель з вялікімі ўражаннямі. Яны засталіся ад цікавай экскурсіі па партызанскіх сцежках і сустрэч з былымі народнымі мсціўцамі, ад канцэртаў мастацкай самадзейнасці, у якіх прымалі ўдзел і байцы інтэратрада імя А. С. Сандзіна, што працавалі ў вёсцы Ламавічы, і ад фестывалю студэнцкіх атрадаў, які адбыўся ў Дзень будаўніка.

Будучыя эканамісты яшчэ неаднаразова ўспомняць, як хадзілі ў дзіцячы сад і майстравалі для дзятвы цацкі, сустракаліся з падлеткамі, якія жывуць побач з інтэрнатам прафтэхвучылішча, і захаплялі іх цікавымі гульнямі, і аб многім іншым, што запаўняла і рабіла насычаным увесь вольны ад работы час будатрадаўцаў.

Зробленыя байцамі сродкі пералічаны ў Савецкі фонд міру. І гэтым нельга не ганарыцца, як і тым, што ты добрасумленна адпрацаваў за праслаўленых герояў Вялікай Айчыннай вайны, сваіх землякоў, братоў Лізюковых, якія былі залічаны ў камуністычны атрад бязвыплатнай працы ганаровымі байцамі.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# АСНОЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ,

**ЯКІЯ РЭКАМЕНДАВАНЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ Ў СТУДЭНЦКІХ АТРАДАХ У ПЕРЫЯД АСЕННІХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ 1984 Г.**

1. Арганізацыя ў студэнцкіх атрадах сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне прадукцыйнасці працы, якасці работы, скарачэнне тэрмінаў уборкі ўраджаю і страт сельскагаспадарчай прадукцыі.

Выкарыстанне ў дзейнасці студэнцкіх атрадаў перадавых метадаў арганізацыі працы, укараненне ў практыку калектыўнай здзельна-прэміяльнай сістэмы аплаты працы, павышэнне эфектыўнасці работы студэнцкіх атрадаў механізатараў, уборачна-транспартных комплексаў, калектываў, выконваючых комплекс работ па схеме «поле — перапрацоўваючае прадпрыемства — магазін».

**Увесь перыяд.**

2. Правядзенне ў кожным студэнцкім атрадзе камсамольскага сходу «Высокая эфектыўнасць і якасць уборачных работ — галоўная задача студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў!»

**1-ы тыдзень работы.**

3. Правядзенне ў студэнцкіх атрадах і раёнах іх дыслакацыі ідэйна-выхаваўчай і грамадска-палітычнай работы.

Арганізацыя палітінфармацый у атрадах. Прапаганда сіламі лектарскіх груп унутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы.

**Увесь перыяд.**

4. Правядзенне ў студэнцкіх атрадах мітынгаў, фестываляў, адзіных палітдзён пад дэвізам «Я галасую за мір!».

**11 верасня.**

5. Арганізацыя сумесна з мясцовай моладдзю тэматычных вечароў, грамадска-палітычных чытанняў, прысвечаных 60-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Пошукавая работа, шэфства над ветэранамі Камуністычнай партыі, вайны і працы, выступленні агітацыйна-канцэртных брыгад.

**Увесь перыяд.**

6. Дзень ударнай працы ў фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

**14 верасня.**

7. Дэкада па аказанню студэнцкімі атрадамі на месцах дыслакацыі шэфскай дапамогі сельскім школам і дашкольным установам у афармленні памяшканняў і кабінетаў, абсталяванні прышкольных участкаў, у будаўніцтве ваенна-спартыўных гарадкоў.

**10—20 верасня.**

8. Арганізацыя ў студэнцкіх атрадах рэйда «Прырода» па ахове навакольнага асяроддзя ў раёнах дыслакацыі.

**Увесь перыяд.**

9. Забеспячэнне бяспечных умоў працы, быту і адпачынку ўдзельнікаў сельскагаспадарчых атрадаў. Правядзенне неабходных прафілактычных мерапрыемстваў па тэхніцы бяспекі і санітарнаму добраўпарадкаванню.

**Увесь перыяд.**

10. Правядзенне ў лінейных студэнцкіх атрадах сходаў, прысвечаных падвядзенню вынікаў асенніх сельскагаспадарчых работ.

**Апошні тыдзень работы.**

